Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Ленінскі вучэбна-педагагічны комплекс яслі-сад- сярэдняя школа»

# Гісторыка-краязнаўчы музей

## Этнаграфічная экспазіцыя

2021 год

## Экспазіцыі музея

- Мужчынскі вугалок
- Жаночы вугалок
- «Ох, лянок, лянок, мой чысты…»
- Чысты пакой
- Ніхто не забыты, нішто не забыта…
- Гісторыя мястэчка Раманава-Леніна
- Гісторыя школы
- Славутыя выпускнікі

Дата заснавання музея
14 лютага 2003г
Загад №18 ад 14.02.2003г.

Адрас школы:
223623, Мінская вобл., Слуцкі р-н
аг. Леніна, вул. Камсамольская, 19.
mailto:lenino@slutskedu.unibel.by
Тэл:4-93-07

## «Мужчынскі вугалок»

Тут рэчы, зробленыя рукамі мужчыны, гаспадара, так як гаспадар у тыя часы павінен быў умець усё: быць бондарам – рабіць прадметы з дрэва: бочкі, бойкі, біклагі, куфэркі, і , канечне, цікавым экспанатам у нас з'яўляецца барыла для захоўвання самагонкі, якую гнаў сам; быў каваль, каваў замкі для аборы, шавец ( унас ёсць капылы для пашыву абутку), касец. Плёў з саломы карабы, з лазы лапці для усіх сямейнікаў, кашы. І канечне – жорны, зробленыя рукамі мужчыны.


Маслабойкі, абплеценыя бутэлькі


Гаспадарчыя прылады

## «Жаночы вугалок»

Тут ёсць і лапата для выпечкі хлеба і вілы, каб прыставіць чыгункі ў печ і мноства збанкоў для малака, і ёмкасць для сыру, сіта, пранікі для мыцця бялізны.


Рэчы гаспадыні


Ступа

## «Чысты пакой»

Тут сабраны лепшыя рэчы: куфар набіты пасагам для дзяўчыны, круглы стол, як сонца, каб не было вуглоў. Ведаеце прыкмету: не садзіся на вугал стала –замуж не пойдзеш. На стале стаяў самавар для гасцей. І канечне, ложак драўляны, яго часцей заказвалі ў майстра на пасаг да вяселля. І ўпрыгожвалі гэты пакой вышыванкамі: рамкамі, дарожкамі. А яшчэ ёсць дзіцячая калыска і стойка для дзяцей.


Дзіцячая калыска і стойка



## «Ох, лянок, лянок мой чысты…»

Не хлебам адзіным жыве чалавек. Патрэбна былі і вопратка, і рэчы для хаты. І галоўную ролю выконваў тут лён. Спачатку лён церлі на церніцах, затым часалі на грабянях, пралі на вось такіх пралках. Пралкі былі розныя, у залежнасці ад гаспадара, ды і жаніхі часта рабілі пралкі для сваіх каханых.


Грэбень для часання льну


Пралка